Сёньня пачынае сваю працу кантрольны пленум ЦК ЛКСМБ

ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 162 (1431). ЧАЦЬВЕР, 16 ліпеня 1931 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менгаркому ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 "
6 месяцаў	1 р. 80 "
1 год	3 р. 60 "

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 908.
ГОД ВЫДАНЬНЯ I.
Кошт асобнага № 2—кап.



Па тэлефону 12-19

Колектывам ЛКСМБ Белкоопсаюзу 12-VII прынята ў КСМ 30 чал. Усяго 54 чал. па колектыву, у сувязі з падрыхтоўкай да кантрольнага пленуму ЦК ЛКСМБ, прынята ў комсамол.

Байнштэйн

ПАРТЫІ БАЛЬШАВІКОЎ—ШМАТМІЛЬЁННУЮ ЛЕНІНСКУЮ ЗЬМЕНУ

ДНІ БАЯВЫХ ТЭМПАЎ РОСТУ МЕНСКАЙ ОРГАНІЗАЦЫІ

13-VII прынята 387 **14-VII прынята 674**

Рост райорганізацыі КСМ за 2-ю пяцідзёнку ліпеня 31 г.

Бялынецкі прынята	30 асоб	Аршанскі	98 "
Б. Кашалеўскі	185 "	Быхаўскі	21 "
Барковіцкі	20 "	Брагінскі	65 "
Грэскі	31 "	Бабруйскі	301 "
Дрысенскі	42 "	Гарадоцкі	88 "
Жыткавіцкі	31 "	Ельскі	30 "
Жлобінскі	44 "	Журавіцкі	64 "
Любанскі	15 "	Карпінскі	73 "
Лоеўскі	43 "	Капыльскі	32 "
Мсціслаўскі	122 "	Крупскі	11 "
Парыцкі	16 "	Клімавіцкі	41 "
Петрыкаўскі	12 "	Мазырскі	55 "
Талочынскі	76 "	Пухавіцкі	36 "
Чырвона-Слабоцкі	20 "	Рэчыцкі	208 "
Мажанскі	6 "	Рагачоўскі	128 "
Крычаўскі	53 "	Старобінскі	39 "


Пералом у росьце к-ву абутковай ф-кі —дасягнут

Комсамольскі колектыў фабрыкі пры дапамозе брыгады Менгаркому у дні агляду, па-ударнаму ўзяўся за ліквідацыю прарываў у галіне росту сваіх радоў.

Пасьля праведзенай масавай работы, правільнай растаноўкі комсамольскіх сіл, колектыў дабіўся пералому.

Закройны цэх поўнасьцю акомсамолены.

Швейны цэх падыходзіць да 100



Група моладзі загатовачнага цэху абутковай фабрыкі уступіўшая у КСМ

проц. уцягненьня рабочай моладзі ў КСМ. Адстаюць машынны і аддзелачны цэхі.

З 12 па 14 ліпеня прынята і афармлена ГК 29 чалавек. Прынята цэхячэйкамі—37 чал. Цяга беспартыйнай моладзі у КСМ значна павялічылася.

Горш абстаіць справа з ростам партядра у комсамоле. За гэтыя дні рэкамендаваны у партыю толькі 3 чал, а бала для росту партыйнага ядра вялікая.

Комсамольскаму колектыву і надалей патрэбна не аслабляць тэмпы росту, для чаго неабходна перабудаваць сваю працу на групах, пры стасоўваючы сваю работу да новага графіка работы фабрыкі, арганізаваць зараз-жа работу з навічкамі і прымалегчы на павялічэньне партядра.

Брыгада.

Рашэньне другога пленуму ЦК УсеЛКСМ будзе выканана

Комсамольскі колектыў Васбуду аб'ядноўвае дзьве вучасткавыя ячэйкі. Моладзі на будаўніцтве каля 300 ч. Колектыў з чэрвеня на ліпень месяц вырас усяго на 55 чал. Апошнія дні далі значнае зьмяншэньне тэмпаў росту.

З прыходам брыгады, якая вылучана Менскім ГК ЛКСМБ для дапамогі комсамольскаму к-ву Васбуду па росту, наглядаецца значны зрух.

За першы дзень працы брыгады, пры дапамозе ўсяго колектыву, уцягнута ў шэрагі КСМ 120 чал. З іх ужо 90 афармлены праз агульныя сходы ячэек.

Першы вучастак будаўніцтва Васбуду—акомсамолены.

Рашэньне 2-га пленуму ЦК УсеЛКСМ аб 100 проц. ахопе да XVII МЮД'у рабочай моладзі комсамолам будзе выканана.

Брыгадзір Казлоў.

Павялічыць тэмпы росту партядра

Моладзі ў друкарні імя Сталіна налічваецца 310 чалавек. У комсамоле да штурмавой пяцідзёнкі было—240, такім чынам, засталося толькі 70 чалавек беспартыйнай моладзі, (з якой частка зьяўляецца служачымі і нядаўна прыбыўшымі на вытворчасьць). З 12-VII па 14-VII у колектыў улілося 46 чалавек. Гэты прыліў атрымаўся дзякуючы ўпартай работы ўсяго комсамольскага колектыву і брыгады ГК. За гэтыя два дні па цэхох праведзены рад масавых мітынгаў, сходаў, індывідуальных гутарак з паасобнымі маладымі рабочымі. Колектыў паставіў перад сабой задачу—поўнасьцю выканаць лёзунг „100 проц. ахоп рабочай моладзі комсамолам“ у часе работы кантрольнага пленуму ЦК ЛКСМБ.

Дрэнна яшчэ пастаўлена работа ў колектыве па падрыхтоўцы і перадачы лепшых комсамольцаў у партыю. За два дні агляду пералому ў гэтай галіне работы не дасягнута. За гэты тэрмін перададзена усяго толькі 4 чал. у партыю.

Комсамольскі колектыў пры сваім буйным росьце, нічога ня прадпрыняў на замацаваньню свайго росту шляхам уцягненьня навічкоў у актыўную работу і падвышэньне іх політычнага ўзроўню.

Брыгадзір ГК Рыўкіна.

Тэмпы росту павысіліся

Тэмпы росту Копыльскай комсамольскай організацыі павысіліся. У той час калі з сакавіка месяцу да 6-га чэрвеня організацыя вырасла на 86 асоб і організавана 5 новых комсамольскіх ячэек, то з 6-га па 25 чэрвеня організацыя вырасла на 110 асоб, організаваны 4 новых ячэйкі.

Дрэнна тое, што новыя ячэйкі не атрымліваюць належнага кіраўніцтва і дапамо і, як з боку партыі ных і старых колгасных комсамольскіх ячэек, так і з боку РК ЛКСМБ.

Таксама слаба выконваецца лёзунг 100 проц. ахопу рабочай і саўгаснай моладзі комсамолам. На заводзе „Пролетары“ ёсьць 40 асоб беспартыйнай моладзі і 30 фабзавучнікаў, а заводзкая ячэйка вырасла з часу 9 і 10 зьездаў на 8 асоб.

Сьвяніцкі

Узяць баявы размах

Лёзунг IX-га зьезду УсеЛКСМ,—„Ператварыць ленінскі комсамол у шматмільённую організацыю яшчэ не засвоены як належыць усімі ячэйкамі, колектывамі і камітэтамі,—як баявая задача, якая ў сваім вырашэньні ня церпіць павольнасьці, няхайскіх адносін, самацёку.

Наглядаецца неразуменьне тых прадпасылак, якія падрыхтавалі вырашэньне гэтай адказнай гісторычнай задачы.

І конкрэтную задачу—пастаўленую кантрольным пленумам ЦК УсеЛКСМ—завяршэньне ў асноўным 100 проц. уцягненьня рабочай і батрацкай моладзі ў КСМ да XVII—МЮД'у гора-тэорэтыкі імкнуцца перавесьці на сваю опортуністычную мову і замест 100 проц. уцягненьня.—„уцягненьне ў комсамол лепшай рабочай моладзі“. А неабходную опэрацыйную, дасланую работу па пэратварэньню комсамолу ў шматмільённую організацыю—падмяняюць мітынгоўшчынай. Як вынік, лік акомсамоленых прадпрыемстваў у Беларусі зусім нязначны. Безумоўна, іх колькасьць з кожным днём пашыраецца. Менская організацыя, у зьвязку з той штурмавой работай па росту, якая праводзіцца гаркомам на прадпрыемствах пры дапамозе ЦК ЛКСМБ дабілася значных зрухаў у росьце. Толькі за 13-е ліпеня было прынята ў комсамол гаркомам 387 чалавек, за 14-е 674.

У асноўным акомсамолены такія прадпрыемствы, як „Комунар“, „Бальшавік“, „Полымя рэволюцыі“, рад дробных прадпрыемстваў, цэхоў і агрэгатаў.

Аднак, каб забясьпечыць завяршэньне 100 проц. уцягненьня рабочай і батрацкай моладзі да 17-га МЮД'у работа павінна быць узмоцнена. Патрэбна больш гнуткасьці камітэтаў, колектываў, больш опэрацыйнасьці ў рабоце. Да 17-га МЮД'у засталіся лічаныя дні. Ня гледзячы на гэта, мы маем усе магчымасьці, каб выканаць гэтую задачу і мы яе выканаем.

Праўда, другая пяцідзёнка ліпеня месяцу па росту дала надзвычайна мізэрныя зрухі. Такія раёны, як: Аршанскі, дзе прынята ў КСМ 98 чалавек, Бабруйскі—301, Гарадоцкі—81—88, Мозырскі—55, Рэчыцкі—208, Рагачоўскі—128, Быхаўскі—21, Крупскі—11, работу па ўцягненьню моладзі ў комсамол разгарнулі вельмі слаба. Аб гэтым сьведчаць прыведзеныя лічбы. І далей, на фоне агульных недахопаў работы па росту КСМ варта падкрэсьліць опортуністычную практыку Хоцімскага райкому КСМ.

Хіба цярпіма такое становішча, каб у раёне, які колектывізаваны на 75 проц., колгасных ячэек было толькі—14? Каб з часу зьездаў (Х-га Усебеларускага, IХ-га Усесаюзнага)—прыняць у КСМ толькі—77 чалавек і не організаваць ніводнае ячэйкі. Гэты махровы опортунізм сьведчыць аб ігнараваньні рашэньняў зьездаў па пэратварэньню ленінскага комсамолу ў шматмільённую організацыю, аб нядольнасьці кіраўніцтва організацыі, мобілізаваць масы комсамольцаў на выкананьне гісторычных рашэньняў зьездаў.

Ня цярпіма-марудныя тэмпы разгортваецца работа ў організацыі па перадачы лепшых комсамольцаў у партыю. Ня толькі значная частка комсамольскіх організацый, а і рад партыйных організацый пытаньню роста ў КСМ, парт'ядра не зьвяртаюць патрэбнай увагі. Не даацэньваюць важнасьці забясьпечаньня парт.-ядрам, парт.-уплывам комсамольскія організацыі. Ня ўлічваюць таго, што, калі зараз парт-ядро ў КСМ складае 6 проц., (што зьяўляецца надзвычайна мізэрным процантам), дык у зьвязку з МЮДаўскім заклікам моладзі ў КСМ—гэты процант яшчэ больш зьменшыцца.

Нарэшце, кепска разгортваецца комсамольскімі організацыямі работа па стварэньню шматмільённай зьмены, па організацыі новых піонэрскіх атрадаў, па вярбоўцы пролетарскай дзетвары ў піонэрскую організацыю. Гэта работа ня ўвязваецца з падрыхтоўкай да другога Усебеларускага зьлёту піонэраў.

Тэмпы работы комсамольскай організацыі па пэратварэньню яе ў шматмільённую, па завяршэньню 100% уцягненьня да 17-га МЮД'у рабочай батрацкай моладзі ў КСМ—павінны быць узмоцнены.

Да XVII МЮД'у ўсе прадпрыемствы павінны быць у асноўным акомсамолены.

Пастанова кантрольнага пленума ЦК УсеЛКСМ аб уцягненьні 1.500.000 моладзі ў КСМ да XVII МЮД'у павінна быць выканана ў тэрмін і поўнасьцю.

Прыняты маладняк з першага-ж дню свайго ўступленьня ў комсамол павінен быць уцягнуты ў актыўную саюзную работу. Ён павінен на справе вучыцца,—выхоўвацца, у гэтай вучобе-рабоце выразна адрозьніваць сваё комсамольскае—сёньня, ад учора—пазакомсамольскага.

Зьняць кіраўніцтва Хоцімскай комсамольскай організацыі за опортуністычную практыку ў росьце

Хоцімскі р-н колектывізаваны на 75 проц. і налічвае каля 80-90 колгасаў і саўгасаў. Колькасьць комсамольскіх саўгасных і колгасных ячэек зусім нязначная—усяго 14. З часу зьездаў не організавана ніводнай ячэйкі. На працягу ўсяго часу пасьля зьезду, Хоцімская організацыя вырасла ўсяго толькі на 77 чалавек. Асабліва дрэнна ідзе рост за лік саўгаснай моладзі. Так, у саўгасе „Рассошава“, дзе маецца 300 рабочых, з іх звыш 120 чал. сталай рабочай моладзі, комсамольская ячэйка налічвае толькі 11 ч.

Праца ў ячэйках ідзе самацёкам. Сярод моладзі сыстэматычнай працы не вядзецца. Палітвучоба ў большасьці ячэек правалена. Рашэньні IX зьезду аб пэратварэньні КСМ у шматмільённую організацыю ў ячэйках ня былі прапрацаваны. У організацыі маецца рад фактаў скажэньня рашэньняў 9 зьезду УсеЛКСМ аб росьце. Калі мы задалі пытаньне сакратару Васілеўскай ячэйкі: „Колькі ў вас колгаснай і бядняцка-серадняцкай моладзі ўцягнута ў КСМ?“—ён адказаў:—„Мы колгаснікаў ня прымаем, у нас усе колгаснікі“. Другі факт: пры колгасе „Васілеўка“ 11 колгасьнікаў падалі заявы ў КСМ і прасілі РК ЛКСМБ організаваць у іх ячэйку, на гэта сакратар РК т. Іофэ адказаў:—„Там усе амаль што серадзякі, таму трэба пачакаць“.

Такое становішча ў організацыі ўвесь час ня выкрывалася таму, што там існуе лютым зажым крытыкі і самакрытыкі. Калі сакратар мястэчковай ячэйкі т. Ліўшыц пакрытыкаваў АПОпрацаўніка РК т. Турока, ён яму заявіў „Мы з табой пагутарым на бюро РК“. Рад хлапцоў з актыву заяўляюць, што да шмат якіх пытаньняў у райкоме дрэнна адносяцца, а крытыкаваць ня хочуць, бо „нападзе за гэта“.

Усе гэтыя факты кажуць аб тым, што кіраўніцтва Хоцімскай організацыі опортуністычна адносіцца да настойлівай перад комсамолам задачы, стаць шматмільённай. ЦК ЛКСМБ павінен жорстка ўдарыць па такому кіраўніцтву. Яно неадкладна павінна быць зьнята.

Брыгадзір ЦК ЛКСМБ Айзенман.

АДВЕСЬЦІ РУКУ АЛАБАМСКІХ КАТАЎ

Дзесяткі мільёнаў абураных мас працоўных падпісваюць касацыйную скаргу Мопру

Мы ўжо паведамлялі аб адтэрмінаваньні пакараньня сьмерцю 8 нэгрыцянскіх маладых рабочых, да разгляду касацыйнай скаргі вярхоўнага суду штату Алабамы.

Гэта адтэрмінаваньне зьяўляецца вынікам тых протэстаў і абурэньня, з якім сустрэлі рабочыя і працоўныя масы правакацыйны прысуд фашысцкага суда.

Гэта павінна ня толькі не аслабіць масавую кампанію протэстаў, але-ж наадварот, кампанія за вызваленьне 8 нэгрыцянскіх рабочых павінна быць яшчэ больш узмоцнена і ў гэтай справе мопраўскія організацыі пры дапамозе комсамолу абавязаны правесьці баявую работу.

Ахвяры фашысцкага тэрору—8 маладых нэгрыцянскіх рабочых павінны быць вызвалены—пад гэтым лёзунгам павінна праводзіцца работа.

Протэстуем супроць зьверстваў амэрыканскага фашызму

Заслухаўшы інформацыю аб жорсткім разгуле амэрыканскага фашызму мы, вучні Бабруйскай школы Дорбудвучу Галоўдартрансу БССР выносім рашучы протэст супроць нячуванага зьверства амэрыканскіх катаў.

У адказ на гэта мы абавязваемся яшчэ з большай энэргіяй дапамагаць матар'яльна і маральна політзьняволеным, якія пакутуюць у фашысцкіх турмах за справу мільёнаў пролетараў.

100 проц. уцягненьне вучняў у шэрагі МОПР'у і ахапленьне іх у ўдарныя брыгады імя МОПР'у.

Будзем змагацца за продукцыйнасьць працы, за ўладаньне тэхнікай і вайсковымі ведамі.

Прэч расавую варожасьць, якую сеюць фашысты.

Няхай жыве сусьветная рэволюцыя якая вызваліць мільёны пролетараў з пад рабаваньняў капіталу.

Патрабуем вызваленьня нашых братоў па клясе

Мы 235 комсамольцаў і беспартыйная моладзь, курсаў па ашчадсправе (Менск) протэстуем супроць зьвёрскага провокацыйнага прысуду да пакараньня сьмерцю —8-мі нэгрыцянскіх рабочых нашых братоў па клясе, патрабуем хутчэйшага вызваленьня іх.

Няхай буржуазія ня думае, што гэтым яна спыніць рэволюцыйны рух, ён будзе ўсё больш і больш узмацняцца.

Пролетарыят і ўсе працоўныя, адказуць на гэтае зьверства вялікімі дэмонстрацыямі протэсту, большым згуртаваньнем вакол компартыі Мы, комсамольцы і беспартыйная моладзь яшчэ больш шчыльна згуртуемся вакол ленінскай нацполітыкі на ўзмацненьне шэрагаў МОПР'у на выкананьне вучэбнага пляну датэрмінова.

Няхай жыве МОПР—

дапаможнік барацьбітам за вызваленьне рабочае клясы.

Няхай жыве пролетарская рэволюцыя ва ўсім сьвеце.

ЭЛЕКТРЫЧНУЮ БАЗУ ПАД ДРУГІ ПЛЯН ВЯЛІКІХ РАБОТ!

Рабсельваенкоры, ваша задача—актыўны ўдзел у складаньні другой пяцігодкі

З залі зьезду.

Сумеснае паседжаньне ўсебеларускага зьезду рабселькораў з прэзыдыумам дзяржпляну, прэзыдыумам акадэміі навук, бюро ЦК ЛКСМБ і бюро сэкцыі навуковых працаўнікоў.


* У клюбе Комуністычнай асьветы—надзвычайная ўрачыстасьць.

* Паседжаньне прысьвечана складаньню новага пляну соцыялістычнага будаўніцтва.

— Мы выконваем і перавыконваем пяцігадовы плян, мы даганяем перадавыя капіталістычныя дзяржавы і пераганяем іх.—Гучэлі словы прамоўцаў.

— Па будаўніцтву сельска-гаспадарчых машын мы выходзім на другое месца, пасьля Злучаных Штатаў. І—адзін толькі Растоўскі Сельмаш выпушчае продукцыі больш чым выпушчала ўся царская „Расея“.

— Магутнасьць будуючыхся нашых электрастанцый перавышае магутнасьць электрастанцый Злучаных Штатаў. Гэта яшчэ не азначае, што мы дагналі Амэрыку, гэта азначае, што мы будуем электрастанцыі большай магутнасьці, чым Амэрыка. Мы пасьпяхова выконваем пяцігодку і будуем соцыялізм. Буржуазны



Дэлегаты ад рабкораў шчотачнай фабрыкі на зьездзе


— На вугалю у 1931 г. Савецкі Саюз займае чацьвёртае месца, пасьля Злучаных Штатаў, Англіі і Нямеччыны. А Бэльгія, якая яшчэ ў 1926 г. давала вугалю ў паўтары разы больш, чым мы—застаецца ў нас ззаду. Даганяем і Францыю, якая ў 1926 г. мела дабычы вугалю ў 2 разы больш чым мы.

сьвет корчыцца ў прадсьмяротных сударгах крызісу.

Вось чаму ў нашага інжынэра тав. Брыцмана, які ездзіў на сусьветную аграрную конфэрэнцыю, амэрыканскія буйныя экономістыя пыталі:

— „Містэр Брыцман, скажэце, што нам рабіць, мы заблыталіся ў гэтым крызісе“.

— Мы будуем новую пяцігодку— на базе электрыфікацыі. Кальцо се-



Выстаўка друку на зьезьдзе

так электрычнасьці ў нас, у БССР будзе праходзіць праз Асіноўскі Сталінстан, праз Прапойск, Гомель, праз Віцебск мы выйдзем да Вялікіх Лукаў. Кальцо магутных станцый ахопіць увесь неабсьцяжны Савецкі Саюз.

— На Беларусі база для электрычнай энэргіі надзвычайна вялікая: ня вычарпальныя тарфяныя нетры.

— Акрамя гэтага, торф дае і хэмічныя продукты—кокс, які прыгодны для мэталюргічнай прамысловасьці, сьпіртус, цэлулозу.

— Мы падходзім да выкананьня пляну першай пяцігодкі. Мы пабудуем другую пяцігодку Для складаньня пляну яе павінна быць мобілізавана ўся пролетарская грамадзкасьць, усе навуковыя сілы, уся творчая праца рабсельваенкораў.

* На паседжаньні з прамовай выступаў адказны рэдактар газэты „Чырвоная зьмена“ тав. Платаў.

* Пасьля ўрачыстага паседжаньня, дэлегаты прагледзелі адрыўкі з продукцыі БелТРАМ'у.

Тодар Алесін

Сябр „чырвоназьменаўскай літбрыгады.

Рабкораўскі марш

Гэх!
Разьвінайцеся
мускулы ў працы,
Гухкай,
масыўнае цела!
На бой,
за пяцьсот
восемнадцаць!
Кроў
як расплавы,
ўскіпела.
Кожны
завод
сваю
здольнасьць паказа—
У штурмах
за тысяча
сорак...
Рвач
і лятун —
[illegible] ганым
[illegible] жа
На вос[illegible] ым
пяры рабкора.
Рынемся
у бойку,—
Рабкораўскім гартам—
На
новыя кроквы
На зрубы!
Пад
кіраўніцтвам
компартыі—
Узьнімаем
фабрычныя трубы...
Працай ударнай,
ударным паходам—
Перабудуем
краіну!..
Брочыць рабкораўскі
ўзвод за узводам,
Крочыць на бой—
бязупынна.

Рабсельваенкораўскі зьезд
—15-VII-1931 г.

ФАШЫСТЫЯ БРУНІНГА „РАТУЮЦЦА“ НА НАДЗВЫЧАЙНЫХ ДЭКРЭТАХ

Соцыял-жандармэры вядуць кампанію супроць камуністычнага друку

ВЫХАД ПРАЛЕТАРЫЯТУ—У РЭВАЛЮЦЫІ

Фінансавы крызіс нясе катастрофы

БЭРЛІН, 14. Фінансавы крызіс ахопвівае ўсё большую колькасьць прадпрыемстваў і гарадзкіх сама кіраўніцтваў Нямеччыны. Рад сярэдніх і дробных прадпрыемстваў не атрымоўвае крэдытаў і звальняе рабочых і служачых. Збыт продукцыі становіцца ўсё цяжэй. Навет такія буйныя прадпрыемствы (як заводы концэрна Сьціменса ў Бэрліне), знаходзяцца пад уплывам новага крызісу. Дырэкцыя Сьціменса абвясьціла аб зьніжэньні сварочнага рабочага часу з 15-га ліпеня. Фінансы гарадзкіх самакіраўніцтваў знаходзяцца ў вельмі цяжкім становішчы, чаму спрыяла таксама зьмяншэньне ўкладаў з камунальных ашчадкас. Асабліва вялікія цяжкасьці наглядаюцца ў Бэрліне і радзе гарадоў Саксоніі паўднёвай і заходняй Нямеччыны.

Крах банкаў у выніку крызісу

ВЕНА, 14. Як паведамляюць з Бухарэсту, у выніку краху нямецкага „Данатбанка“ працягваецца масавае абсьледваньне ўкладаў і каротка-тэрміновых крэдытаў у буйнейшых банкаў „Мармараш, Бланк і Ко“ і „Банка Хрысавалон“, якія зьвязаны з нямецкімі банкамі.

У выніку банкроцтва Румынскага банка „Жэнэрале Романа“ абвясьцілі учора спыненьне плацяжоў Клаузэнбурскі банк „Цацыя“. Румынскі ўрад рыхтуе закон аб уводзеньні дзяржаўнага кантролю над усімі банкаўскімі опэрацыямі ў выглядзе цэнтральных фінансавых інстытутаў, у якія ўвойдуць прадстаўнікі ўраду, нацыянальнага (эмісыйнага) банку і саюзу банкіраў.

Банкіры ў сполаху перад крызісам у Нямеччыне

БЭРЛІН, 14. Як паведамляюць з Швейцарыі, біржы Цюрыха, Базэля і Жэнэвы парашылі часова спыніць котыроўку нямецкіх акцый і пазык. Па паведамленьню з Голяндыі аб'яднаньне амстэрдамскіх банкіраў парашыла пакуль устрымацца ад опэрацый з нямецкімі банкамі. Па паведамленьню з Даніі і з раду іншых месц, спынены абмен нямецкіх марак па ўсіх банках і разьменных кантарах.

Інтэрвэнты рыхтуюцца

БЭРЛІН, 14. „Кэльнішэ Цэйтунг“ адзначае, што ўжо на працягу некалькіх тыдняў, у Варшаве вядуцца перамовы між польскім генштабам і знаходзячымся ў Варшаве начальнікам Румынскага генштабу Самсоновічам па пытаньню аб заключэньні патаемнай дадатковай згоды да Румына-Польскага ваеннага дагавору.

Нямецкі фашызм узмацняе рэпрэсіі супроць комуністычнага друку

БЭРЛІН, 12. „Прэс Дынст“ паведамляе аб забароне на тры тыдні выходзячай у Брэслаўлі комуністычнай газэты „Арбэйтэр цэйтунг“. Газэта забаронена за паведамленьне аб провокацыях Бэрлінскай паліцыі. Буржуазная „Бэрлінэр тагеблат“ указвае, што сыстэматычныя забароны комуністычных газэт маюць мэтай поўнасьцю ўдушыць і падарваць у фінансавых адносінах комуністычны друк.

„Арбэйтэр Цэйтунг“ забаронена на тры тыдні

БЭРЛІН. 14. Забаронена на тры тыдні комуністычная газэта „Арбэйтэр Цэйтунг“ у сувязі з надрукаваньнем артыкулу, накіраванага супроць паліцыі.

Адбываюцца пасьпяховыя набегі чырвоных

Салдаты і афіцэры з нанкінскіх войск не жадаюць змагацца

ШАНХАЙ. 13. Згодна японскім паведамленьням, нанкінскія войскі сустракаюць усё большыя цяжкасьці ў барацьбе супроць чырвоных армій у провінцыі Янцзы: салдаты і афіцэры не жадаюць змагацца. Увесь час узьнікае неабходнасьць рэорганізацыі асобных ваенных частак; бесьперапынна адбываюцца пасьпяховыя набегі чырвоных армій.

Кантрольны пленум ЦК ЛКСМБ

Сёньня, 16-га ліпеня а 6-й гадзіне ўвечары, у клюбе імя Леніна (Пас. Вакзал) адбываецца 3-ці Пленум ЦК ЛКСМБ з абвесткай дню;

1. Аб выкананьні рашэньняў X Зьезду ЛКСМБ і IX Зьезду УсеЛКСМ аб ператварэньні комсамолу ў шматмільённы (т. Гутвін).
2. Аб выкананьні рашэньняў Зьездаў Комсамолу аб удзелу ЛКСМБ у пац. культбудаўніцтве (т. Рубенчык).
3. Даклад Белторпаб'яднаньня і праверка выкананьня дырэктыў аб удзеле ЛКСМБ у вырашэньні тарфяной проблемы (прадстаўнік Белторпаб'яднаньня т. Шаўцоў).
4. Вынікі ўдзелу ЛКСМБ у вясновай сяўбовай кампаніі і аб уборачнай і асеньня-сяўбовай кампаніі (прадст. НКЗему і т. Сапега.)

Уваход па мандатам сяброў і кандыдатаў ЦК ЛКСМБ і рэвізыйнай комісіі і па розданым запрашальным білетам.

Сэкратар ЦК ЛКСМБ Палякоў.

УСІМ РАЙКАМОЛАМ!

Забясьпечце актыўны ўдзел ячэек ЛКСМБ у баявой згдачы—пяцідзёнкі праверкі выкананьня дырэктыў партыі аб перабудове спажывецкай кооперацыі. Організуйце брыгады. Праверце работу ячэек комсамола па перабудове кооперацыі. Матар'ялы шліце рэдакцыі газ. „Чырвоная Зьмена“.

Сэкратар ЦК ЛКСМБ ПАЛЯКОЎ.

Да пленуму ЦК ЛКСМБ

НОВУЮ ТЫСЯЧУ КОМСАМОЛЬЦАЎ-ТАРПЯНОМУ ДОНБАСУ

40 райкомаў ЛКСМБ прыходзяць да пленуму ЦК з ганебнай плямай прарыву

Нарад на конкрэтныя справы прымаем

Комсамольцы торпазаводу „Грэбянёва“ адказваюць:

Заслухаўшы выклік плянава-опэрацыйных груп торпазаводу „Чырвоная Беларусь“, мы прымаем выклік. Усе вызначаныя абавязкі мы выканаем. Падтрымоўваем патрабаваньне комсамольцаў аб выданьні пазыкі ўдзелу ленінскага комсамолу ў складаньні гэнэральнага пляну. Мы ўсе будзем падпісчыкамі гэтай пазыкі.

Агульны сход комсамольскай ячэйкі заводу „Грэбянёва“.

Ад рэдакцыі: Чакаем адказу на выклік комсамольцаў „Чырвоная Беларусь“—ад астатніх торпазаводаў.

Рапартуюць пераможцы.

Да кантрольнага пленуму ЦК ЛКСМБ Гарадокская ячэйка ЛКСМБ перавыканала заданьне па мобілізацыі комсамольцаў на торпараспрацоўкі. Замест вызначаных па разьвёрстцы двух комсамольцаў, мы мобілізавалі—пяць.

Сэкратар ячэйкі ЛКСМБ Тараховіч.

Адным з асноўных пытаньняў, якое абмяркуе кантрольны пленум ЦК ЛКСМБ, які сёньня адбываецца зьяўляецца пытаньне аб становішчы выкананьня пляну торпаздабычы на 1931 г. і ўдзелу комсамолу ў барацьбе за поўнае выкананьне промфінпляну торпапрамысловасьці.

Пляны торпаздабычы на 11-е ліпеня выкананы ўсяго на 21 проц. Комсамол Беларусі высунуў лёзунг аб ператварэньні Савецкай Беларусі ў тарпяны Донбас. Такое становішча з выкананьнем плянаў, якое мы маем на сёньняшні дзень, ні ў якім разе не забясьпечвае выкананьня гэтага лёзунгу.

Да пленуму ЦК 40 раёнаў прыходзяць з невыкананьнем дырэктывы аб мобілізацыі 1000 комсамольцаў на торпазаводы. Ня ўсе комсамольскія ячэйкі торпазаводаў сталі актыўнымі ўдзельнікамі гаспадарчага жыцьця заводу, ня ўсе ячэйкі сталі організатарамі соцспаборніцтва і ўдарніцтва ў кожнай брыгадзе, ля кожнай машыны.

3 сакратары райкомаў ЛКСМБ зьняты з работы за ўпартае нежаданьне правесьці гэтую мобілізацыю, за опортуністычныя адносіны да работы торпазаводу.

Зараз ЦК ЛКСМБ пастанавіў, у дадатак да раней вызначаных 1000 комсамольцаў мобілізаваць яшчэ 1000 чалавек. Мобілізацыю правесьці ў дэкадны тэрмін.

Гэта праца павінна быць праведзена па-ўдарнаму,—ня менш 2000 чалавек комсамол павінен даць торпазаводам.

Адным з галоўнейшых пунктаў у радзе пастаноў ЦК ЛКСМБ—зьяўляецца пытаньне аб разгортваньні культ масавай працы на торпазаводах, якая да гэтага часу знаходзіцца ў заняпадзе.

Пленум ЦК ЛКСМБ вызначыць далейшыя шляхі ўдзелу комсамолу ў ператварэньні Беларусі ў тарпяны Донбас.

Забесьпячэньне заводаў рабочай сілай, перабудова комсамольскай работы, масавае разгортваньне соцспаборніцтва і ўдарніцтва.

Справа ператварэньня Беларусі ўтарпяны Донбас—ёсьць справа ўсяго комсамолу,

На 2-м усебеларускім зьезьдзе рабселькораў тав. Гей у сваёй прамове, застанавіўшыся на пытаньні торпаздабычы, сказаў: „На падставе гэтай таннай энэргетычнай базы будзе расьці прамысловасьць БССР, альбо яна ня будзе расьці зусім“—гэта ляжа ў аснову абгаварэньня пытаньня выкананьня плянаў торпаздабычы на пленуме ЦК ЛКСМБ.

Поўнасьцю скарыстаць мобілізаваных комсамольцаў

Рацыянальнае, найбольш поўнае скарыстаньне мобілізаваных комсамольцаў на ліквідацыю прарываў на торпараспрацоўках. — адзін з найважнейшых момантаў ліквідацыі прарыву. Гэтага ня ўлічыла ні адміністрацыя, ні комсамольская і профсаюзныя організацыі торпазаводу „Шлях соцыялізму“.

Прыяжджаючыя комсамольцы на некалькі дзён гуляюць, пакуль ім вызначаюць працу. Гэта стала сыстэмай і ніхто не прабуе з ёю змагацца. Дырэктар кажа: „ну, што-ж пашукаем, дзе можна яго скарыстаць, тады і наставім на працу, хай пачынае“.

Злачынна скарыстоўваюцца комсамольцы і партыйцы, мобілізаваныя з папяровай фабрыкі „Гэрой Працы“ якія працуюць на падвясной дарозе. Ёсьць выпадкі, калі некаторыя рабочыя працуюць на тры зьмены папрад, а потым тры дні гуляюць.

Сярод мобілізаваных ёсьць комсамольцы, якія па стану здароўя ня могуць працаваць на торпараспрацоўках. Райкомы комсамолу павінны больш сур'ёзна падыходзіць да адбору пасылаемых на торпазаводы комсамольцаў.

Комсамольская організацыя торпзаводу павінна забясьпечыць поўнае скарыстаньне мобілізаваных комсамольцаў.

С. Ф.

2000 КОМСАМОЛЬЦАЎ—ТАРПЯНЫМ НЕТРАМ

Опортуністы Маркевіч і Варановіч—з працы зьняты

З пастановы бюро ЦК ЛКСМБ ад 13-га ліпеня 1931 г. аб ходзе выкананьня плянаў торпаздабычы і выкананьня пастановы ЦК, аб мобілізацыі 1000 комсамольцаў

1. Адзначыць, што становішча выкананьня програмы торпаздабычы знаходзіцца пад пагрозай зрыву (на 9-VII торфінплян выкананы па БССР на 21 проц, што з-за незабясьпечаньня апалам, пагражае спыненьнем шэрагу прадпрыемстваў.

Райкомы комсамолу не прынялі неабходных захадаў у забясьпечаньні выкананьня плянаў торпаздабычы мобілізацыя тысячы комсамольцаў на торпзаводы ня выканана, ЦК КП(б)Б прызнаў гэта ганебным для комсамольскай організацыі.

2. За невыканаиьне мобілізацыі комсамольцаў на торпзаводы зьняць з працы сэкратара Смалявіцкага РК ЛКСМБ Маркевіча і нам. сэкратара Клімавіцкага РК КСМ Варановіча.


3. Правесьці мобілізацыю другой тысячы комсамольцаў на торпараспрацоўкі. Скончыць ле ў дэкадны тэрмін, да 25 ліпеня.

4. Прапанаваць Барысаўскаму, Крупскаму, Смалявіцкому, Бярэзінскаму, Сьмілавіцкому, Чэрвеньскаму Асіпавіцкому, Суражскаму, Лёзьненскаму, Копіскаму, Чаускаму, Чэрыкаўскаму, Клімавіцкаму, Мсьціслаўскаму, Раснянскаму, Краснапольскаму, Леднянскому, Азарыцкаму, Рагачоўскаму, Бабруйскаму, Старадарожскаму, Слуцкаму, Лепельскаму, Сеньненскаму, Бешанковіцкому, Камарынскаму, Юравіцкаму, Ельскаму Брагінскаму, Чачэрскаму, Буда-Кашалеўскаму, Цэрахоўскаму, Крачоўскаму, Касьцюковіцкаму, Хоцімскаму, Койданаўскаму, Высачанскаму, Горацкаму, Каханоўскаму, Клімавіцкаму райкомам ЛКСМБ ня выканаўшым разьвёрсткі першай тысячы,—скончыць да 25 ліпеня.

5. Накіраваць не пазьней 15-VII ўпаўнаважаных ЦК у колькасьці 30-ці асоб у дапамогу правядзеньню мобілізацыі, Падбор і інструктаваньне даручыць тав. Шаўцову. Абавязаць усіх упаўнаважаных ЦК не зьвяртацца з раёнаў да выкананьня разьвёрсткі.

6. Даручыць рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена“ узяць пад непасрэдны нагляд правядзеньне скапчэньня мобілізацыі першай тысячы і мобілізацыі другой тысячы комсамольцаў на торпараспрацоўкі,—штодзённа зьмяшчаючы зводкі ходу мобілізацыі.

Гэту пастанову апублікаваць у друку.



Комсамольцы лічаць сябе гасьцямі на заводзе

Дрэнна абстаіць справа з мобілізацыяй комсамольцаў па Магілеўскім раёне.

Значная колькасьць мобілізаваных, прапрацаваўшы некалькі дзён на заводзе, пакінулі працу. Астатнія мобілізаваныя комсамольцы ня прымаюць ніякага ўдзелу ў працы комсамольскай організацыі заводу.

На торпазаводзе „Грэбянёва“ працуе 7 мобілізаваных комсамольцаў, якія штодня пасьля працы пакідаюць завод і ўходзяць у Магілеў.

Комсамольскіх сходаў не наведваюць. Ніякай працы ў сваёй брыгадзе і наогул сярод рабочых заводу яны не праводзяць.

Гэтыя факты сьведчаць аб тым, што мобілізаваныя комсамольцы не зразумелі сваіх абавязкаў у працы на торпазаводзе—быць ўдарнікам ня толькі ля машыны, але ўключыцца ў грамадзкае жыцьцё заводу, быць актыўнымі грамадзкімі працаўнікамі, бо гэта адзін з важнейшых вучасткаў барацьбы за промфінплян.

П.

РАЗЬВЁРСТКА

мобілізацыі другой 1000 комсамольцаў на торпараспрацоўкі

Торпазавод „Асінторп“ (Аршанскі раён)

1.	Віцебск	62 чал.
2.	Магілеў	20 „
3.	Ворша	100 „
4.	Шклоў	34 „
5.	Дуброўна	37 „
6.	Крупкі	20 „
7.	Талачын	15 „
8.	Горкі	30 „
9.	Лепель	10 „
10.	Лёзна	15 „
11.	Мсьціслаў	35 „
12.	Чаусы	20 „
13.	Чэрыкаў	20 „
14.	Рагачоў	27 „
15.	Жлобін	20 „
	Усяго	405 чал.

Торпазавод Смалявіцкага раёну „Смалявічы“

1.	Менск	150 чал.
2.	Бярэзіна	10 „
3.	Чэрвень	20 „
4.	Асіповічы	20 „
5.	Бабруйск	60 „
6.	Клічаў	20 „
	Усяго	280 чал.

Торпазавод „Шлях Соцыялізму“ (Гом. р-н, ст. Добруш)

1.	Гомель	50 чал.
2.	Карма	10 „
3.	Хойнікі	10 „
4.	Ельск	10 „
5.	Мозыр	10
6.	Буда-Кашалеў	10
7.	Церахоўка	10
8.	Ветка	10
9.	Рэчыца	20 „
10.	Лоеў	10
11.	Брагін	10 „
	Усяго	160 чал.

Торпазавод „Колектыўная Праца“ (Клім. раёну)

1.	Клімавічы	30 чал.
2.	Ст. Дарогі	15 „
	Усяго	45 чал.

Торпазавод „Бальшавік“ (Уварав. р-ну)

1.	Уваравічы	20 чал.
2.	Камарын	15 „
	Усяго	35 чал.

Торпазавод „Чырв. Беларусь“ (Быхаўск р-ну)

1.	Быхаў	15 чал.
	Усяго	15 чал.

Усяго па разьвёрстцы—1000 чал.

Сэкратар ЦК ЛКСМБ *Палякоў*


Нам. заг. экан. мас. аддз. ЦК *Шаўцоў*.

Комсамолка Ліпак—дэзэртыр

У ліку мобілізаваных на торпараспрацоўкі ў колектыве Белсампрамсаюзу была і комсамолка Ліпак. Сярод ад'ехаўшых на працу было шмат беспартыйных, якія добраахвотна згадзіліся працаваць на торпараспрацоўках. А комсамолка Ліпак, прапрацаваўшы адзін дзень на торпазаводзе пакінула працу. Дэзэртыр імкнуўся усялякімі сродкамі апраўдаць свой ганебны ўчынак, але маса комсамольцаў, якая штодзень змагаецца за выкананьне промфінпляну, належным чынам ацаніла дзеяньні „комсамолкі“ Ліпак, якая, як высьветлілася на наладжаным грамадзкім судзе, была ілжэўдарніцай, доўгі час не наведвала комсамольскіх сходаў. Дэзэртыр выключаны з комсамолу.

Выконваем ганаровы абавязак ліквідацыі прарыву.

С. Тулік.



ХТО БОЛЬШ І ЛЕПШ ПРАЦУЕ, ТОЙ БОЛЬШ І АТРЫМЛІВАЕ

КОМСАМОЛІЯ! ВЫШЭЙ ТЭМПЫ ПАХОДУ ЗА УЛІК ПРАЦЫ. КОЖНАМУ КОЛГАСЬНІКУ ДАВЕСЬЦІ ПАРАДАК РАЗЬМЕРКАВАНЬНЯ ЎРАДЖАЙНАСЬЦІ

Пастанова Наркамзему СССР і Колгасцэнтру СССР аб прыкладным разьмеркаваньні даходаў у колгасах у 1931 годзе

Шырокая популярызацыя, правільнае правядзеньне ў жыцьцё друкуемай сёньня пастановы аб парадку разьмеркаваньня даходаў у колгасах, зьяўляецца найважнейшым магутным вагарам для ўзьняцьця вытворчасьці працы, ударных тэмпаў правядзеньня ўборачнай кампаніі і далейшага масавага росту колектывізацыі.

Біцца за поўны перавод колгасаў на сапраўдную зьдзельшчыну, ацэненую ў працаднёх, скончыць з посьпехам правядзеньне комсамольскага паходу за правільны ўлік працы ў колгасах, уручыць кожнаму колгасьніку запоўненую працоўную кніжку,—безадкладная задача вясковага комсамолу.

Да 1-га жніўня кожны колгасьнік павінен ведаць, як будзе разьмяркоўвацца ўраджай і даход свайго колгасу. І таму комсамольская організацыя абавязана зараз-жа разгарнуць масавую работу, зараз-жа мобілізаваць сілы на шырокую популярызацыю гэтай пастановы.

Разьдзел I

Правільнае разьмеркаваньне даходаў і ўраджаю ў колгасах па колькасьці і якасьці затрачанай працы і згодна запісанай у працоўную кніжку колгасьніка колькасьці працадзён мае рашаючае значэньне для вытворчага замацаваньня колгасаў, павялічэньня матар'яльнай зацікаўленасьці кожнага колгасьніка ў рабоце, павышэньня продукцыйнасьці працы колгасьнікаў і далейшага росту колгаснага руху.

У адпаведнасьці з ростам вопыту асноўнай масы колгасьнікаў у гэтым годзе, ва ўсіх раёнах і ва ўсіх колгасах павінны быць бязумоўна адкінуты меўшыя месца ў мінулым годзе недахопы ў разьмеркаваньні даходаў. Гэтыя недахопы выявіліся:

1. У разьмеркаваньні даходаў на душах, а не на колькасьці і якасьці затрачанай працы.
2. У разьмеркаваньні пад уплывам кулацкай агітацыі збожжа першага абмалоту сярод колгасьнікаў адразу наперад на цэлы год, што расстройвала працдысцыпліну і было аднэй з галоўнейшых прычын вялікіх страт пры ўборцы ўраджаю 1930 году.
3. У адсутнасьці правільнай організацыі, а таксама кантролю за выдачай грашовых і натуральных авансаў колгасьнікам.
4. У заблытанасьці ўліку даходаў колгасу і адсутнасьці правільнага ўліку затрачанай колгасьнікам працы.
5. У заблытанасьці разьлікаў паміж колгасамі і інш. організацыямі.
6. У яўна невыстарчальным удзеле масы колгасьнікаў у абгаварэньні парадку разьмеркаваньня грашовай і натуральнай часткі даходаў, зацяжцы ў разьмеркаваньні даходаў.
7. У яўна невыстарчальным кіраўніцтве практыкай разьмеркаваньня даходаў з боку зямельных і колгасных органаў.

Для таго, каб унікнуць памылак мінулага году, дапушчаных пры разьмеркаваньні даходаў, Наркамзем СССР і Колгасцэнтр абавязваюць зямельныя і колгасныя органы правесьці наступныя мерапрыемствы.

Разьдзел II

1. Добра разьмеркаваць даходы немагчыма без дакладнага ўліку затрачанай колгасьнікамі працы і ўсіх атрыманых імі авансаў грашыма і натурай. Таму кожны колгас абавязаны да пачатку ўборкі прывесьці ў поўную яснасьць запісы колгасьнікаў у яго працоўную кніжку, выпрацаваную ім колькасьць працадзён, а таксама выданыя колгасьніку авансы грашыма і натурай у лік выпрацаваных ім працадзён і ў далейшым ні ў якім выпадку не дапускаць спазьненьня запісаў працадзён у кніжку колгасьніка, праводзячы іх ня радзей аднаго разу ў пяць дзён.

2. Праўленьні колгасаў абавязаны з асаблівай дакладнасьцю організаваць улік усяго сабранага ўраджаю, ні ў якім выпадку не дапускаць ссыпкі і складваньня продуктаў без адпаведных запісаў, для чаго набыць неабходную колькасьць вагі, а ў выпадку немагчымасьці дастаць вагу, організаваць прасьцейшы спосаб вымерваньня: мерамі, скрынкамі, мяшкамі, абмерам і г. д.

3. Рэвізыйныя комісіі ў колгасах абавязаны не радзей аднаго разу ў месяц правяраць правільнасьць уліку продуктаў і матар'ялаў і сваячасовасьць запіс паступаючых даходаў і выдаткаў, сваячасовасьць і правільнасьць запісу працадзён у працоўныя кніжкі колгасьнікаў.

Не пазьней 1-га жніўня ў паўднёвых раёнах і 15 жніўня іншых раёнах рэвізыйныя комісія ў кожным колгасе павінна зрабіць даклад агульнаму сходу колгасьнікаў (або сходу ўпаўнаважаных) аб выніках запісу працадзён у разрахунковыя кніжкі колгасьнікаў.

Разьдзел III

1. З валавога даходу ў колгасе разьмеркаваньню паміж колгасьнікамі належыць:

а) харчовае збожжа і іншыя продукты за выключэньнем належачых здачы (продажу) па контрактацыі і за выключэньнем насеннага, страхавога і спэцыяльных харчовых фондаў, якія ствараюцца па пастанове колгасьнікаў;

б) кармы за выключэньнем належачых здачы (продажу) дзяржаве і фондаў, якія адкладваюцца для таварных фэрм і абагуленай жывёлы колгасаў і страхавых фуражных фондаў;

в) грашовыя сродкі за выключэньнем тых, якія належаць да выплаты запазычанасьці, падаткаў, а таксама тых, якія адкладаюцца для забесьпячэньня пляну капітальнага будаўніцтва, на куплю інвэнтару і мат'ярялаў і інш. выдаткаў для вядзеньня гаспадаркі і адлікаў у спэцыяльныя грамадзкія фонды.

2. У тых колгасах, дзе азімыя пасевы яшчэ не аграмаджаны, па пастанове агульнага сходу яны павінны быць аграмаджаны і ўключаны ў валавы даход колгасаў. Уборка азімых пасеваў робіцца колектыўна.

Агульны сход колгасьнікаў абгаворвае і ўстанаўляе парадак і ўмовы, на якіх аграмаджаюцца азімыя.

3. Усе працадні колгасьнікаў, выпрацаваныя з 1 студзеня 1931 г. да 1 га студзеня 1932 г., у тым ліку і на азімым пасеве, зябленьні, шматгадовых насаджэньнях (травы, сады і інш.) і капітальным будаўніцтве, павінны быць залічаны пры разьмеркаваньні даходу 1931 г.

Разьдзел IV

Харчовая частка валовага даходу разьмяркоўваецца так:

1. Выконваецца дагавор па контрактацыі на здачу (продажы) продукцыі дзяржаве.

2. Ствараецца насенны фонд у разьмерах, якія забясьпечваюць пашырэньне пасеўнай плошчы ў 1932 годзе ня менш, як на 10-20 проц., у адпаведнасьці з плянам пашырэньня пасеваў колгасу на 1932 г, і страхавы насенны фонд у разьмеры—10-15 проц. насеннага.

3. Ствараецца спэцыяльны харчовы фонд.

а) для забесьпячэньня сем'яў колгасьнікаў, якія маюць малую колькасьць працаздольных і не выпрацавалі, ня гледзячы на сваю добрасумленную работу, колькасьці працадзён, неабходнай для забесьпячэньня сям'і харчамі;

б) для забесьпячэньня настаўнікаў, аграномаў, зоотэхнікаў ветэрынарных дактароў, якія абслугоўваюць колгас;

в) для забесьпячэньня адыходнікаў і іх сем'яў, якія ня могуць атрымаць неабходнай для іх колькасьці хлеба і кармоў для жывёлы ў выпадку невыстарчальнай колькасьці ў сям'і працаздольных, з такім разьлікам, каб адыходнікі і іх сем'і атрымалі харчаваньне і кармоў столькі-ж колькі атрымлівае колгасьнік, добрасумленна працаваўшы ў колгасе. Калі працаздольныя члены сямьі адыходніка адмаўляюцца ад работы ў колгасе, дык сям'я адыходніка гэтай ільготай не карыстаецца.

Увага: Выдача з паказанага ў пункце трэцім харчовага фонду робіцца колгасам па ўстаноўленых дзяржаўных цэнах.

4. Уся асноўная маса харчовых продуктаў, за вылікам зданай (прадананай) па контрактацыі, адкладзенай у насенны, страхавы і спэцыяльныя харчовыя фонды, разьмяркоўваецца паміж колгасьнікамі па колькасьці і якасьці працы, згодна выпрацаваным працаднём, запісаным у працоўную кніжку колгасьніка.

Увага 1: Па меры ходу абмалоту і выкананьня ўзятых на сябе колгасам абавязацельстваў па контрактацыі колгасьнікам выдаюцца авансы харчовымі продуктамі ў лік продукцыі, якая ім прылічваецца ў адпаведнасьці з выпрацаванымі імі працаднямі. Авансы выдаюцца ў разьмеры, які ўстанаўляецца колгасам.

Увага 2: У кожным колгасе, у залежнасьці ад колькасьці харчовых продуктаў, якія належаць разьмеркаваньню паміж колгасьнікамі, устанаўляецца вышэйшы разьмер харчовага збожжа, якое атрымлівае колгасьнік, выпрацаваўшы найбольшую колькасьць працадзён, пры чым звыш гэтага ўстаноўленага разьмеру колгасьнік, даход, які яму прылічваецца, атрымлівае грашыма. Колгасьнік, які выпрацаваў меншую колькасьць працадзён, атрымлівае параўнальна з лепшым колгасьнікам меншую колькасьць харчовага збожжа.

Разьдзел V

Кармовая продукцыя колгасу разьмяркоўваецца так:

а) выконваецца плян здачы (продажу) дзяржаве ўсіх кармоў у разьмерах, прадугледжаных дагаворам аб контрактацыі:

б) ствараецца фуражны фонд грубых і концэнтраваных кармоў для поўнага забесьпячэньня патрэбнасьці таварных колгасных фэрм і рабочай абагуленай продукцыйнай жывёлы колгасу і запасны фуражны фонд для пашырэньня жывёлагадоўлі, якое намячаецца з фонду, які прызначаны для абагуленай жывёлы павінна быць выдзелена незалежная частка для рабочай жывёлы на час падрыхтоўкі і правядзеньня вяснавой сяўбы.

Кармы, якія адлічаны для колгасных таварных фэрм, броніруюцца за таварнымі фэрмамі і могуць быць выдаткаваны толькі на патрэбы таварных фэрм;

в) усе кармы, якія застаюцца пасьля выкананьня дагавору па контрактацыі і стварэньня фуражнага і запаснога фуражнага фондаў, разьмяркоўваюцца паміж колгасьнікамі, якія маюць продукцыйную жывёлу, па колькасьці выпрацаваных колгасьнікам працадзён з улікам наяўнасьці ў яго продукцыйнай жывёлы;

Увага: Колгасьнікі, якія ня маюць продукцыйнай жывёлы, атрымліваюць долю даходу, якая ім прылічваецца, замест фуражу—грашыма.

г) колгасьнік, які набудзе продукцыйную жывёлу пасьля разьмеркаваньня ўраджаю, можа атрымаць неабходную колькасьць кармоў у адпаведнасьці з выпрацаванай ім колькасьцю працадзён з запаснога фуражнага фонду.

Разьдзел VI

Пасьля таго, як з грашовых даходаў колгасаў вылічылі падаткі, страхоўку і запазычанасьць па крэдытах, якія неабходна аплаціць у 1931 годзе, колгас адлічвае:

1. 15 проц. у старых колгасах і 10 проц. у колгасах, організаваных пасьля кастрычніка 1930 году, у непадзельны фонд, які прызначаецца для набыцьця машын, рабочай і продукцыйнай жывёлы і на капітальнае будаўніцтва.

Непадзельны фонд выдзяляецца ў грошах (у рублёх).

2. 2 проц. для разьмеркаваньня па маемасьці, аграмаджанай колгасьнікамі, галоўным чынам, па кошту аграмаджанай імі продукцыйнай жывёлы.

3. 1 з пал. проц. у прэміяльны фонд для прэміяваньня лепшых колгасьнікаў-ударнікаў, брыгадзіраў.

4. 1 з пал. проц. для дапамогі колгасьнікам, якія пасылаюцца на розныя курсы.

Увага: у раёнах, дзе няма яшчэ суцэльнай колектывізацыі, паказаны ў п. п. 2, 3, 4 фонд разьмяркоўваецца згодна аграмаджанай маемасьці. Разьмер гэтага фонду вызначаецца ў 5 проц. даходу.

5. 2 проц. у культурна-бытавы фонд.

6. Уся асноўная маса грашовых сум, за выключэньнем тых, якія адлічваюцца ў пералічаныя вышэй фонды, а таксама аплата вытворчых выдаткаў, разьмяркоўваецца паміж колгасьнікамі адпаведна колькасьці працадзён, выпрацаваных кожным колгасьнікам і запісаных у яго працоўную кніжку.

Разьдзел VII

Парадак і тэрмін разьмеркаваньня даходаў устанаўляюцца праўленьнем колгасу і зацьвярджаюцца агульным сходам колгасьнікаў, кіруючыся наступнымі палажэньнямі:

1. Праўленьні колгасаў абавязаны зрабіць разьмеркаваньне паміж колгасьнікамі долі даходаў за 1931 год, якая ім прылічваецца, не пазьней 15 студзеня 1932 году.

2. Для задавальненьня патрэб колгасьнікаў да канчатковага разьмеркаваньня даходаў у колгасе, на пастанове праўленьня колгасу колгасьнікам могуць выдавацца грашовыя і натуральныя авансы выключна ў лік выпрацаваных колгасьнікам працадзён, прычым, авансы могуць выдавацца толькі тым колгасьнікам, якія выконваюць працоўныя заданьні праўленьняў колгасаў.

3. Пры канчатковым разрахунку з колгасьнікамі з агульнай сумы долі даходаў, якая ім прылічваецца, павінны быць утрыманы ўсе натуральныя і грашовыя авансы, якія былі выданы колгасьнікам на працягу году.

4. Праўленьням колгасаў даецца права пазбаўляць натуральных і грашовых авансаў колгасьнікаў, якія дрэнна працуюць па ўборцы, азімай сяўбе і зяблевым ворыве, прычым выдачу авансаў такім колгасьнікам адносіць у апошнюю чаргу.

5. Абавязаць праўленьні колгасаў да 1 кастрычніка 1931 у паўднёвых раёнах і да 1 лістапада ў іншых раёнах прыкладна вызначыць разьмер разьмяркоўваемых сярод колгасьнікаў даходаў і выдаць колгасьнікам у адпаведнасьці з выпрацаванай імі колькасьці працадзён каля 2/3 усёй іх долі даходу з тым, каб апошняя трэць была выдана пры канчатковым разрахунку не пазьней 15 студзеня 1932 году.

* * *

Наркомзем СССР і Колгасцэнтр абавязваюць праўленьні колгасаў, райза і райколгассаюзы організаваць шырокае абгаварэньне гэтай пастановы з тым, каб кожны колгасьнік ведаў парадак разьмеркаваньня даходаў не пазьней першага жніўня.

Абавязаць наркомземы саюзных рэспублік, колгасцэнтры, аблкрайзу і аблкрайколгассаюзы арганізаваць масавую праверку няўхільнага выкананьня гэтай пастановы.

У гэтым годзе ні ў адным колгасе не павінна быць дапушчана разьмеркаваньня даходаў як грашовых, таксама і натуральных на душах.

Наркомзем СССР і праўленьне Колгасцэнтру СССР напамінаюць усім колгасьнікам абавязковую пастанову VI зьезду саветаў, у якой гаворыцца:

„Разьмеркаваньне даходаў, (як грашовых, так і натуральных) не па колькасьці і якасьці ўкладзенай колгасьнікамі працы, а па душах вельмі часта праводзіцца кулакамі і іншымі ворагамі колгасаў, якія прабуюць сарваць колгасную справу. Такім аматарам пажыць за лік чужой працы неабходна аказваць самы рашучы адпор аж да выключэньня іх з колгасаў. Разьмеркаваньне колгасных даходаў па прынцыпе—хто больш і лепш працуе, той больш і атрымлівае, хто не працуе, той нічога не атрымлівае,—павінна стаць правілам для ўсіх колгасьнікаў і колгасаў.

Народны камісар земляробства Саюзу ССР Я. Якоўлеў.

Старшыня праўленьня Колгасцэнтру Т. Юркін.

12 ліпеня 1931 г.

Колгасьнікі перад выездам на сенажаць.

Аб ліквідацыі 23 раёнаў у БССР

Пастанова Бюро ЦК ЛКСМБ ад 13-VII-31 г.

1. Комсамольскія ячэйкі ліквідуемых раёнаў далучаюцца да тых Райорганізацый, да якіх далучаецца тэрыторыя ліквідуемага раёну, згодна пастановы ЦВК БССР ад 8-VII-31 г.

2. Прапанаваць ліквідуемым раёнам склікаць пленум, на якім заслухаць справаздачу бюро РК.

3. Упаўнаважаным ЦК ЛКСМБ па ліквідацыі і далучэньні ліквідуемых райорганізацый, зацьвердзіць наступных таварышоў:

1. Па Баркавіцкаму раёну—Быхаўскі
2. Круглянскаму раёну—Русакова.
3. Чачэвіцкаму раёну—Баранава.
4. Капаткевіцкаму раёну—Шэйнкман.
5. Журавіцкаму раёну—Фрысман.
6. Халопяніцкаму раёну—Кленскі.
7. Кохаоўскаму раёну—Элькін.
8. Грэскаму раёну—Маркевіч.
9. Юравіцкаму раёну—Штальберг.
10. Сьмілавіцкаму раёну—Шкурко.
11. Высачанскаму раёну—Маскалёў.
12. Копыскаму раёну—Сьвенцыцкі.
13. Ляднянскаму раёну—Юневіч.
14. Чарэйскаму раёну—Верас.
15. Межанскаму раёну—Грабоўскі.
16. Хоцімскаму раёну—Іоффэ.
17. Расьнянскаму раёну—Родкін.
18. Сьвіслацкаму раёну—Бужвалаў.
19. Багушэўскаму раёну—Сянкевіч.
20. Ве рынскаму раёну—Пліс.
21. Вульскаму раёну—Цярэнцеў.
22. Дрыбенскаму раёну—Дзявісенка.
23. Азарыцкаму раёну—Баранкін.

Старшынёй ліквідацыйнай камісіі зацьвярджаецца ўпаўнаважаны ЦК ЛКСМБ. У склад камісіі павінны ўвайсьці старшыня рэвізыйнай камісіі ліквідуемага раёну і ад раёну да якога далучаецца ліквідуемая організацыя, сэкратар райкому, альбо сябра РК ЛКСМБ.

4. У абавязку ліквідацыйнай камісіі ўваходзіць перадача комсамольскіх ячэек да далучаемага раёну, вучот організацыі і актыву. Справы за 1930 і 1931 г. г., адпраўка статсправаздач па становішчы організацыі ў ЦК ЛКСМБ, адсылка ўсяго архіву райкому комсамолу ў Цэнтраархіў (Магілеў) з опісью і актам, складаньне дакладнай нісулькі для ЦК па вынікам ліквідацыі раёну і прыёму далучаемага за подпісьсю поўнага складу ліквідацыйнай камісіі.

5. Прапанаваць рэвізыйным камісіям ліквідуемых раёнаў утварыць рэвізію. Акт рэвізіі і срокі застоўшыяся ў РК пераслаць у ЦК ЛКСМБ, заастрыўшы асаблівую ўвагу на ліквідацыю запазычанасьці камітэтам па шэфскіх, інтэрнацыянальных і інш. узносах. Адказнасьць за нагляд па правядзеньню рэвізыі ўскладаецца на ліквідацыйную камісію.

6. Разьмеркаваньне адказных працаўнікоў зацьвердзіць, адначасова ЦК ЛКСМБ папярэджвае, пад адказнасьць упаўнаважанага ЦК, ні ў якім разе не адпускаць на іншыя работы комсамольскіх работнікаў бяз ведама ЦК ЛКСМБ.

7. Спрэчныя пытаньні ў часе ліквідацыі і перадачы ўскладаецца на вырашэньне ліквідацыйнай камісіі, за выключэньнем аб работніках РК.

Увага: сьпіс разьмеркаваньня работнікаў дасланы райкомолам.

Прыбрана 110 га сенажаці

Колгас „Комсамолец" (Любанскі раён) на ўдарнаму разгарнуў уборку сенажаці. Уся работа па ўборцы сенажаці ў колгасе праведзена на зьдзельшчыну, ацэненую ў працаднёх. Вядзецца сталы ўлік працадзён кожнага колгасьніка па колькасьці і якасьці работы. На ўборцы сенажаці шырака разгорнута соцспаборніцтва і ўдарніцтва.

Дзінамітаў.

Адказны рэдактар МІХ. ПЛАТАЎ.

Друкарня імя тав. Сталіна. Галоўлітбел № 599